УДК 371

***Н.Дз. Цімафеенка***
(Магілёў)

# МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ФАРМІРАВАННЯ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ ВУЧНЯЎ У АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ

*В данной статье рассматривается целесообразность комплексного использования традиционных методов обучения, активных методов обучения и методов дистанционного обучения для формирования коммуникативной компетентности учащихся в образовательном процессе.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Ключевые слова:** коммуникативная компетентность учащихся, традиционные методы обучения, активные методы обучения, методы дистанционного обучения, семинар, тренинг, дискуссия, "круглый стол", "мозговой штурм", деловая игра, ролевая игра.

*This article describes the expedience of complex usage of traditional, active and distance teaching methods aimed at formation of students' communicative competence in the educational process.*

**Keywords:** students' communicative competence, traditional teaching methods, active teaching methods, distance teaching methods, a seminar, a training, a discussion, a round table discussion, "brain storm", a business game, a role play game.

У сучасным грамадстве патрабуюцца не проста адукаваныя, а творчыя людзі, кампетэнтныя асобы, якія ўмеюць адстойваць асабістыя меркаванні, лагічна выражаць думкі, валодаць багаццем выразнага маўлення, шанаваць роднае слова. Менавіта на развіццё творчай і ўсебакова развітай асобы школьніка накіраваны адукацыйны працэс. Вучэбныя прадметы "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" спрыяюць фарміраванню чытацкіх і камунікатыўных кампетэнцый вучняў, што з'яўляецца найважнейшай умовай для ўступлення ў сацыякультурны дыялог. Аднак, у сваёй педагагічнай практыцы я сутыкнулася з наступнымі супярэчнасцямі. З аднаго боку, у новых вучэбных праграмах па беларускай мове і літаратуры (V–IX класы) вызначаны прадметныя кампетэнцыі: літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная, культуралагічная, культуратворчая, маўленчая і камунікатыўная [3]. З другога боку, адсутнасць беларускамоўнага асяроддзя для вучняў, якія не вельмі любяць чытаць, а асноўнай крыніцай інфармацыі для іх становіцца рускамоўны Інтэрнэт, не спрыяе фарміраванню камунікатыўнай кампетэнтнасці. Зыходзячы з гэтых супярэчнасцей, вынікае неабходнасць так арганізаваць вучэбную прастору, каб вучэбныя прадметы "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" сталі прывабнымі для школьнікаў, спрыялі іх асобаснаму развіццю. Яе вырашэнне я бачу праз арганізацыю сваёй дзейнасці на аснове кампетэнтнаснага падыходу, арыентуючыся на наступныя метадычныя аспекты фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці вучняў. Да метадаў навучання, якія мэтазгодна выкарыстоўваць для развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці ў адукацыйным працэсе, адносяць традыцыйныя метады, метады актыўнага навучання, трэнінгі, метады дыстанцыйнага навучання.

***Традыцыйныя метады*** навучання карысныя пры перадачы інфармацыі аб псіхалогіі людзей, аб метадах і прыёмах, якія выкарыстоўваюцца ў зносінах. Да традыцыйных метадаў адносяць лекцыі, гутаркі, прагляд навучальных фільмаў, самастойную работу з вучэбнымі тэкстамі, пісьмовыя заданні. Гэтыя метады даюць магчымасць дэманстраваць узор маналагічнай і дыялагічнай прамовы, дазваляюць развіваць вуснае і пісьмовае маўленне, моўную культуру



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

слухачоў. Аднак для развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці традыцыйныя метады найменш эфектыўныя.

Вялікія магчымасці ў развіцці камунікатыўнай кампетэнтнасці закладзены ў ***метадах актыўнага навучання***. Да такіх метадаў адносяць семінар, «мазгавы штурм”, дыскусію, дыспут, “круглы стол», дзелавыя і ролевыя гульні. Гэтыя метады даюць магчымасць мадэляваць рэальныя камунікатыўныя сітуацыі, знаходзіць рашэнне канкрэтнай камунікатыўнай задачы і адчуць наступствы прынятых рашэнняў. Метады актыўнага навучання вельмі эфектыўныя, паколькі дазваляюць вучням адпрацаваць навыкі міжасобасных зносін у тыповых сітуацыях, атрымаць зваротную сувязь, скарэкціраваць свае паводзіны і знаходзіць альтэрнатыўныя спосабы вырашэння камунікатыўных праблем.

*Семінары* – гэта такая форма арганізацыі навучання, пры якой на этапе падрыхтоўкі дамінуе самастойная праца навучэнцаў з вучэбнай літаратурай і іншымі дыдактычнымі сродкамі над серыяй пытанняў, праблем і задач, а ў працэсе семінара ідзе актыўнае абмеркаванне, дыскусіі і выступленні навучэнцаў, дзе яны пад кіраўніцтвам педагога робяць абагульненне.

*“Мазгавы штурм”* – аператыўны метад вырашэння праблемы на аснове стымулявання творчай актыўнасці, пры якім удзельнікам абмеркавання прапануюць выказваць як мага большую колькасць варыянтаў рашэння, у тым ліку самых фантастычных. Затым з агульнай колькасці выказаных ідэй адбіраюць найбольш удалыя, якія могуць быць выкарыстаны на практыцы. Пры правядзенні «мазгавога штурму» забараняецца крытыка і заахвочваецца любая ідэя, нават жартоўная ці відавочна недарэчная. Усе выказаныя ідэі запісваюцца для наступнага іх разгляду групай экспертаў. Пасля зацвярджэння рашэння “генератары ідэй” размяркоўваюцца на яго праціўнікаў і прыхільнікаў з мэтай выяўлення слабых месцаў і іх выпраўлення [1].

*Дыскусія* – абмеркаванне спрэчнага пытання, праблемы. Важнай характарыстыкай дыскусіі, якая адрознівае яе ад іншых відаў спрэчкі, з’яўляецца аргументаванасць. Абмяркоўваючы спрэчную (дыскусійную) праблему, кожны бок, апаніруючы думку суразмоўцы, аргументуе сваю пазіцыю [2; 5].

Пад дыскусіяй таксама маецца на ўвазе калектыўнае абмеркаванне якіх-небудзь праблем, спрэчных пытанняў. Дыскусія часта разглядаецца як метад, які актывізуе працэс навучання, вывучэння складанай тэмы, тэарэтычнай праблемы. З дапамогай дыскусіі навучэнцы набываюць новыя веды, умацоўваюцца ва ўласным меркаванні, вучацца яго адстойваць.

“*Круглы стол*” – гэта метад актыўнага навучання, адна з арганізацыйных формаў пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, якая дазваляе замацаваць атрыманыя раней веды, папоўніць неабходную інфармацыю, сфарміраваць уменні вырашаць праблемы, умацаваць пазіцыі, навучыць культуры вядзення дыскусіі. Характэрнай рысай «круглага стала» з’яўляецца спалучэнне тэматычнай дыскусіі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з групавой кансультацыяй. Разам з актыўным абменам ведамі, у навучэнцаў выпрацоўваюцца ўменні выкладаць думкі, аргументаваць свае меркаванні, абгрунтоўваць прапанаваныя рашэнні і адстойваць свае перакананні. Важная ўмова пры арганізацыі «круглага стала»: трэба, каб ён быў сапраўды круглым, г. зн. працэс камунікацыі, зносін, адбываўся «вочы ў вочы».

*Гульня* з'яўляецца важным аспектам фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў у адукацыйным працэсе.

*Дзелавая гульня* выкарыстоўваецца для вырашэння комплексных задач засваення новага, замацавання матэрыялу, развіцця творчых здольнасцей, фарміравання агульнавучэбных уменняў, дае магчымасць навучэнцам зразумець і вывучыць навучальны матэрыял з розных пазіцый.

У навучальным працэсе прымяняюцца розныя мадыфікацыі дзелавых гульняў: імітацыйныя, аперацыйныя, ролевыя гульні, дзелавы тэатр, псіха- і сацыядрама.

*Імітацыйныя гульні.* На занятках імітуецца дзейнасць якой-небудзь арганізацыі, прадпрыемства або яго падраздзялення, напрыклад, фірмы, аддзела, цэха і г. д. Імітавацца могуць падзеі, канкрэтная дзейнасць людзей (дзелавая нарада, абмеркаванне плана, правядзенне гутаркі і г. д.) і абстаноўка, умовы, у якіх адбываецца падзея або ажыццяўляецца дзейнасць (кабінет начальніка аддзела, зала пасяджэнняў і г. д.).

*Аперацыйныя гульні.* Яны дапамагаюць адпрацоўваць выкананне канкрэтных спецыфічных аперацый, напрыклад, методыкі напісання сачынення, рашэння задач, вядзення прапаганды і агітацыі. У аперацыйных гульнях мадэліруецца адпаведны працоўны працэс. Гульні гэтага тыпу праводзяцца ва ўмовах, якія імітуюць рэальныя.

*«Дзелавы тэатр».* У ім разыгрываецца якая-небудзь сітуацыя, паводзіны чалавека ў гэтай абстаноўцы. Тут навучэнец павінен мабілізаваць увесь свой вопыт, веды, навыкі, здолець ужыцца ў вобраз пэўнай асобы, зразумець яе дзеянні, ацаніць абстаноўку і знайсці правільную лінію паводзін. Асноўная задача метаду інсцэніроўкі — навучыць вучня арыентавацца ў розных абставінах, даваць аб'ектыўную ацэнку сваім паводзінам, улічваць магчымасці іншых людзей, усталёўваць з імі кантакты, уплываць на іх інтарэсы, патрэбы і дзейнасць. Для метаду інсцэніроўкі складаецца сцэнар, дзе апісваюцца канкрэтная сітуацыя, функцыі і абавязкі дзеючых асоб, іх задачы.

*Псіхадрама і сацыядрама.* Яны вельмі блізкія да дзелавога тэатра. Гэта таксама тэатр, але ўжо сацыяльна-псіхалагічны, у якім адпрацоўваецца ўменне адчуваць сітуацыю ў калектыве, ацэньваць і змяняць стан іншага чалавека, уменне ўвайсці з ім у прадуктыўны кантакт.

***Сацыяльна-псіхалагічны трэнінг*** – адзін з метадаў актыўнага навучання і псіхалагічнага ўздзеяння, якое ажыццяўляецца ў працэсе інтэнсіўнага групавога ўзаемадзеяння, і накіраваны на павышэнне кампетэнтнасці ў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сферы зносін, у якім агульны прынцып актыўнасці навучэнца дапаўняецца прынцыпам рэфлексіі над уласным паводзінамі і паводзінамі іншых удзельнікаў груп [2].

У працэсе трэнінгу ў навучэнцаў фарміруюцца індывідуальна-спецыфічныя прыёмы і спосабы камунікацыі, заснаваныя на іх індывідуальных асаблівасцях.

Паўсюдна ўкараняецца ***дыстанцыйнае навучанне,*** якое адрозніваецца высокай ступенню структураванасці вывучаемага матэрыялу і пакрокавай ацэнкай яго засваення. У залежнасці ад сродкаў перадачы інфармацыі пры дыстанцыйным навучанні можна вылучыць:

* навучанне праз сетку Інтэрнэт (вэб-курсы) у асінхронным рэжыме без непасрэднага ўдзелу выкладчыка;

* навучанне з дапамогай віртуальнага класа праз сетку Інтэрнэт ( вэб-канферэнцыі), калі выкладчык і навучэнцы адначасова знаходзяцца на адным і тым жа сайце ў сетцы Інтэрнэт (сінхронны рэжым).

Кожны з разгледжаных метадаў навучання мае свае асаблівасці, сваю вобласць прымянення і абмежавання. Усё гэта неабходна ўлічваць пры іх ужыванні. Калі абдумана падбіраць і камбінаваць метады навучання, то можна больш эфектыўна развіваць камунікатыўныя ўменні. Для развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў найбольш прымальным і рацыянальным з’яўляецца інтэграваны падыход.

**Літаратура**

1. Вагапова, А. В. Психологическое сопровождение профессионального становления личности студента в условиях вузовского образования / А. В. Вагапова, Е. Е. Бочарова // Психология образования в XXI веке : теория и практика. – Москва, 2009. – С. 168–172.
2. Васильев, Г. С. Проблема коммуникативных способностей / Г. С. Васильев. – Москва : Речь, 2001. – 21 с.
3. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. Беларуская літаратура.V–IX класы. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі. – 2017. – 116 с.
4. Мартынкевіч, С. В. Камунікатыўна-маўленчы патэнцыял асобы школьніка : дыягностыка і аналіз / С. В. Мартынкевіч // Креативные подходы к организации образовательного процесса : сб. материалов науч.- практ. конф. – Гомель, 2007. – Ч. 2. – С. 117–122.
5. Снопкова, Е. И. Педагогические системы и технологии : учебное пособие / Е. И. Снопкова. – 2-е изд., испр. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2013. – 416 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова